Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-02-06

# Напамін пра Першую сусветную

**Напрыканцы студзеня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя выдання «Беларусь в годы Первой мировой войны» (2013 г.) кандыдата гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Валянціны Бялявінай. Праца адлюстроўвае падзеі Першай сусветнай вайны і побыт насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Адметнаю рысай выдання з'яўляецца вялікая колькасць найцікавейшых дакументальных фотаздымкаў таго часу.**

Да імпрэзы падрыхтаваная выстаўка «Вялікая забытая вайна», на якой прадстаўленыя выданні 1914–2013 гг.: успаміны сучаснікаў і сведкаў вайны, справаводчая дакументацыя, публікацыі ў перыядычным друку, даследаванні айчынных і замежных навукоўцаў. Вялікую цікавасць уяўляюць дакументы, выдадзеныя пад час вайны, якія належалі да розных дзяржаваў і грамадска-палітычных лагераў. Сярод старэйшых крыніцазнаўчых дакументаў – брашура «Устав Белорусского Общества по оказанию помощи пострадавшим от войны» (1915 г.), перыёдыка 1914–1918 гг.: газеты «Наша Ніва», «Гоман», «Belarus», часопісы «Вестник могилёвского земства», «Минские Епархиальные ведомости» і іншыя. Таксама ў экспазіцыі – апавяданне выдатнага дзеяча беларускай культуры Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» (1926 г.), напісанае на аснове дзённікавых запісаў і нататак, якія вёў пісьменнік у кароткіх перапынках паміж баямі.

Дапаўняюць кніжную экспазіцыю копіі фотаздымкаў часоў Першай сусветнай вайны, зробленыя яе ўдзельнікамі. Сярод іх фота з франтавога альбома «Памятки войны 1914–1917 гг.» беларускага паэта, празаіка, этнографа, мастака Уладзіслава Паўлюкоўскага, які пад час вайны служыў у расійскім войску ў чыне прапаршчыка. Арыгіналы яго фотаздымкаў, створаных на тэрыторыі Беларусі, захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*